**Конан, М.** Браць цяжэйшую ношу / М. Конан // Віцебскі рабочы. — 1987. — 1 мая. — С. 4.

# БРАЦЬ ЦЯЖЭЙШУЮ НОШУ

У дыспетчарскай было шумна: заходзілі за пуцёўкамі вадзіцелі, званілі з аб'ектаў наконт будматэрыялаў, турбавала начальства. Ліда Лось, дыспетчар па транспарту, усім растлумачвала:

– Пачакаем Сяргея. Вернецца з абеду – тады ўсё і вырашым.

І ніхто асабліва не настойваў, не пярэчыў, хаця Лось магла б рашыць многае сама. Проста ўсе чакалі Сяргея Крыцкага, старшага інжынера-дыспетчара ПМК-24.

Я спрабаваў завесці размову з адным, то з другім з прысутных у дыспетчарскай пра Сяргея, даведацца, што ён за чалавек і які работнік, аднак усе адказвалі быццам завучанымі фразамі:

– Хлопец спакойны, сціплы. Чалавек ён наогул надзейны.

Тут жа, у дыспетчарскай, даведаўся, што Крыцкі да службы ў арміі паспеў закончыць Лепельскі гідрамеліярацыйны тэхнікум, а нядаўна паступіў завочна ў Беларускую сельгасакадэмію. Паступова пачалі праясняцца рысы характару камсамольца, стыль яго работы.

– Неяк летась, – расказвае Л. Лось, – былы дыспетчар быў у водпуску, і Сяргей працаваў за дваіх. І тут раптам сам захварэў. Дык разумеце, з тэмпературай пад 40 на работу прыходзіў. Мы ўжо і ўшчувалі яго, і ў бальніцу прапаноўвалі завезці, а Крыцкі, бывала, расправіць раніцай транспарт, падгоніць першачарговыя справы і тады толькі скажа: «Пайду дадому, крыху адпачну». А потым зноў у дыспетчарскую прыходзіў. Відаць, не лічыў для сябе асаблівай цяжкасцю цяперашнюю работу. Там, у час службы ў арміі, было цяжэй.

Пра тое, як было там, у Афганістане, Сяргей успамінаць не любіць. Ніхто дакладна ў дыспетчарскай не ведаў, за што Сяргей Крыцкі ўзнагароджан двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Нават у Лепельскім райкоме камсамола, які пастаянна наладжвае сустрэчы ветэранаў, удзельнікаў вайны з моладдзю, не маглі толкам расказаць аб гэтым.

– Крыцкага «разгаварыць» цяжка. Сціплы ён, відаць, занадта.

І не толькі ён адзін такі. У ПМК-24 працуюць яшчэ тры былыя воіны-інтэрнацыяналісты: Аляксандр Пшонка, Іван Міхно і Ігар Былінскі. І ніхто асабліва не любідь успамінаць мінулае.

– А, што расказваць, – паціскае плячыма Ігар, – мы выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак. З Сяргеем служылі ў адным падраздзяленні, толькі я раней. Хто прайшоў тую баявую школу – другім чалавекам становіцца. Там адразу бачна, хто чаго варты.

Былінскі, высокі хударлявы хлопец, кідае раз-пораз позірк у мой бок, круціць у руках прамаслены кавалак анучы і таксама не спяшаецца з успамінамі.

... Сяргей паказаўся на двары нечакана. Ён ішоў шпарка, нават крыху парывіста. Невысокі, ён здаваўся здалёк падлеткам. А зблізку сталым рабілі яго вочы. Востры і хуткі погляд іх быццам рэнтгенам прашчупваў кожнага незнаёмца: а што ты за чалавек і з чым прыйшоў, як да цябе трэба адносіцца?

За нейкіх дзесяць-пятнаццаць мінут Крыцкі расправіў вадзіцеляў з дыспетчарскай, падпісаў неабходныя дакументы, выдзеліў транспарт для перавозкі будматэрыялаў, сазваніўся з кіраўніцтвам і, пакінуўшы замест сябе ўчотчыцу, рашуча сказаў:

– Пайшлі наверх. Там ёсць пусты пакой. Тут нам не дадуць пагаварыць.

Ва ўсіх дзеяннях Сяргея адчувалася хоць і мяккая, але катэгарычная ўпэўненасць, што ён робіць усё правільна, што інакш нельга. І ніхто старшаму інжынеру-дыспетчару не пярэчыў. А Крыцкі, між іншым, на гэтай рабоце ўсяго крыху больш года, адразу пасля службы ў арміі. Другому, каб заняць такую пасаду, трэба было б, відаць, яшчэ колькі год пахадзіць у «маладых ды ранніх». А Сяргею даверылі. І нездарма. У час службы ў арміі яму давяралі большае і самае дарагое – жыццё людзей, такіх, як ён сам, маладых хлопцаў.

– Было гэта ў час маёй другой аперацыі ў гарах, – успамінае Сяргей, і шэрыя вочы яго цямнеюць, нават з’яўляюцца маршчынкі вакол іх, – Мы дапамагалі воінам афганскай арміі абараняць ад душманаў сопку, адкуль добра прастрэльвалася дарога на кішлак, па якой дастаўляліся харчаванне і іншыя мірныя грузы. Нас было васьмёра, старшым – я. У адной з сутычак непрыкметна падкраліся да душманскага ўмацавання. Кароткая перастрэлка. Але нашых нават нікога не раніла. А душманы разбегліся, пакінулі цэлую гару зброі. Сцямнела. Спускацца ў ніз было рызыкоўна – маглі быць засады. Ды і несці адным столькі зброі немагчыма. А тут яшчэ горы пакрыў густы туман. Наогул, двое сутак ахоўвалі трафеі, адбівалі спробы душмакаў зноў заняць умацаванне і чакалі верталёта.

Такіх сутычак было шмат. Яны вымотвалі сілы, як струны, нацягналі нервы. Часта даводзілася трапляць пад перакрыжаваны агонь душманскіх кулямётаў. Страчваў таварышаў.

Але Сяргею не менш запомнілася, як яны аднойчы дапамагалі ахоўваць ад душманаў кішлак. Людзі там памяркоўныя, даверлівыя. Савецкіх салдат як след размясцілі, накармілі, распытвалі аб жыцці. Хоць рабяты і не ўсё разумелі з роспытаў, але добра адчувалі сапраўдную цікавасць да нашай краіны. Гэта ўсяляла ўпэўненасць, што інтэрнацыянальная дапамога патрэбна менавіта простым людзям, тым, хто вырошчвае хлеб, давала сілы на новыя аперацыі па ачыстцы ад душманаў кішлакоў і пасёлкаў.

У Крыцкага быў ужо даволі вялікі баявы вопыт, калі неяк на другім годзе службы яго ў час аперацыі паклікаў камандзір падраздзялення.

Яшчэ толькі світала.

– Вось што, Крыцкі, бяры трох маладых байцоў – і вунь на тую сопку. Неабходна замацавацца і трымацца да нашага падыходу.

Як і належыць, выйшлі ціха і непрыкметна. Але на сопцы нечакана трапілі пад агонь душманаў. Кароткі бой, і ўсё, здавалася б, скончана. Але ў гэты момант з суседняй будыніны прагучаў выстрал снайпера, і куля навылёт прабіла горла.

– Пашанцавала табе, сяржант, – гаварыў у шпіталі хірург пасля аперацыі. – Каб крыху бліжэй да соннай артэрыі…

А дадому Крыцкі слаў пісьмы амаль з аднолькавым зместам. «Служба ідзе нармальна, усё па-старому. Асаблівых навін няма. Чакайце дадому». Пра раненне маці, Надзежда Данілаўна, даведалася толькі пасля службы, калі сын вярнуўся дамоў. Ён паказваў два баявыя ордэны, а бацькі, знаёмыя і асабліва дзед, які ваяваў у Вялікую Айчынную, усё ніяк не маглі адразу паверыць, што іх Сяргей здольны на подзвіг.

Нават сёння, успамінаючы нядаўняе мінулае, Крыцкі, не можа спакойна расказваць аб адной страшнай ночы, калі іх падраздзяленне акружылі пераўзыходзячыя сілы душманаў, пра той зацяжны бой на сопцы.

Было ўжо гэта пасля ранення, ды і да канца службы заставалася з месяц. І так хацелася жыць.

Душманы, адчуваючы, што супраціўленне слабее, з крыкамі лезлі наверх. Адбілі адну атаку, другую. Наўкола – дым ад палаючай сухой травы. Вецер гоніць яго ў твар. Вухкаюць узрывы мін. Аднекуль па сопцы метадычна і прыцэльна б'е гармата. Агонь душманскіх кулямётаў не дае магчымасці ўзняць галаву. Патронаў – у абрэз. Але застаюцца яшчэ гранаты. І, выбраўшы момант, Сяргей кідае іх адну за другой уніз. На нейкі час крыкі сціхаюць. А потым усё паўтараецца зноў...

І ўсё ж сопку адстаялі. Перамаглі страх. Праверылі, хто на што здольны. Паверылі ў сябе. А гэта, бадай, самая важная перамога. Перамога над сабой. Бо і ў мірным жыцці для былога воіна-інтэрнацыяналіста хапае перашкод, дастаткова «вышынь», якія трэба заваёўваць штодзённа. І браць на сябе даводзіцца зноў цяжэйшую ношу. Бо інакш нельга. Інакш можна страціць форму, апынуцца ў тыле, сысці на абочыну. А гэтага дапускаць нельга.

**М. Конан**